*А.Г. КАХАНОЎСКІ*

# АСАБЛІВАСЦІ ЭВАЛЮЦЫІ САСЛОЎНЫХ ІНСТЫТУТАЎ У БЕЛАРУСІ Ў XIX – пачатку XX ст.

Проанализированы основные направления социально-сословной политики российского правительства на территории Беларуси в XIX – начале XX в., интеграции сословно-корпоративной организации белорусского общества периода ВКЛ в социальную систему Российской империи. Выделены особенности и основные черты эволюции сословных институтов в Беларуси в XIX – начале XX в.

The article analyses the main trends of social-class policy of Russian government on the territory of Belarus in XIX – the beginning of XX century, integration of the class-corporative organization of the Belarusian society in the period of the Great Lithuanian principality into social system of the Russian empire. Distinguished are the particularities and main lines of the evolution of class institutes in Belarus in XIX – the beginning of XX century.

Саслоўная арганізацыя складала аснову сацыяльнай сістэмы Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. Гэта быў асноўны прыярытэт для захавання стабільнасці пануючага рэжыму і лаяльнасці нярускіх падданых у дачыненні да дынастыі. Саслоўны прынцып з'яўляўся адным з тых, што дазваляў ўратаваць цэласнасць шматнацыянальнай імпе-

рыі і вызначаў сацыяльныя сувязі[1]. Гэтую функцыю саслоўных інстытутаў не магла замяніць нацыянальная ці канфесійная ідэалогія. Прыярытэт дынастычных і саслоўных прынцыпаў над этнічнымі і моўнымі быў агульным для Расійскай імперыі і іншых шматнацыянальных дзяржаў[2]. Беларускія землі, як і іншыя заходнія вобласці, да часу ўваходжання ў склад Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст. мелі адметную і больш развітую саслоўна-карпаратыўную арганізацыю, чым цэнтральныя губерні[3]. На працягу большай часткі XIX ст. расійскі ўрад імкнуўся уніфікаваць, наблізіць сацыяльную арганізацыю беларускага грамадства да стандарту велікарускіх губерняў.

Традыцыйна даследчыкамі вылучаюцца наступныя прыкметы саслоўя: заканадаўчае афармленне і замацаванне саслоўных абавязкаў і правоў, сацыяльных функцый і заняткаў; перадача прыналежнасці да пэўнага саслоўя ў спадчыну; наяўнасць саслоўных карпаратыўных арганізацый; адметны менталітэт і самасвядомасць саслоўяў. Адпаведна расійскаму заканадаўству асобы, якія не належалі ні да аднаго з саслоўяў, павінны былі прыпісацца да аднаго з падатковых саслоўяў. Атрыманне саслоўнага звання адбывалася праз перадачу яго ў спадчыну ці набывалася шляхам узнагароды, выслугі, прыпіскі (для падатковых саслоўяў), паляпшэння адукацыйнага ўзроўню.

Даследаванне механізма функцыянавання саслоўных інстытутаў мае ключавое значэнне для вывучэння сацыяльнай структуры і стратыфікацыі беларускага грамадства, характарыстыкі грамадска-культурнага жыцця, разгортвання этнічных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. У айчыннай і замежнай гістарыяграфіі эвалюцыя саслоўных інстытутаў у Беларусі не набыла комплекснага асэнсавання, атрымалі асвятленне толькі асобныя фрагменты дадзенай праблемы – характарыстыка правоў і становішча дваранства, купецтва і сялянства, асноўных кірункаў урадавых мерапрыемстваў у дачыненні асобных саслоўных груп насельніцтва. Дадзеная тэматыка знайшла адлюстраванне на старонках прац А.П. Жытко, А.М. Лютага, Н.І. Палятаевай, В.П. Панюціча, С.М. Самбук, У.А. Сосны, М.М. Улашчыка, З.В. Шыбекі і інш.[4]

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца аналіз асаблівасцей і асноўных кірункаў эвалюцыі саслоўных інстытутаў у Беларусі ў кантэксце сацыяльнай палітыкі ўрада Расійскай імперыі на тэрыторыі заходніх губерняў у XIX – пачатку XX ст.

Саслоўная палітыка расійскага ўрада на беларускіх землях была сугучнай зменам у нацыянальна-культурнай сферы. Нерэалізаванае польскае пытанне стала пунктам адліку для сацыяльна-саслоўнай палітыкі, эвалюцыі саслоўных інстытутаў. Этапы развіцця нацыянальна-вызваленчага руху на тэрыторыі заходніх ускраін Расійскай імперыі сталі вехамі ў фарміраванні саслоўна-групавога складу насельніцтва беларускіх губерняў. Да паўстання 1830–1831 гг. расійская ўрадавая палітыка была дастаткова талерантнай да нацыянальных асаблівасцей, захоўвалася фактычна саслоўная структура насельніцтва, якая існавала да падзелаў Рэчы Паспалітай. Пашырэнне расійскага заканадаўства, спробы наблізіць функцыянаванне саслоўных інстытутаў да стандарту цэнтральных губерняў (пачатак палітыкі «разбору шляхты» і інш.) праводзіліся нерашуча і непаслядоўна. Часам урадавыя мерапрыемствы рэалізоўваліся без разумення спецыфікі сітуацыі ў заходніх губернях і прыводзілі да блытаніны, ускладнялі і без таго стракатую структуру насельніцтва. Адчувалася пэўная разгубленасць у вызначэнні лёсу асобных саслоўных груп, прысутнічалі супярэчнасці паміж цэнтральнымі і мясцовымі органамі ўлады ў вызначэнні палітыкі. Прадстаўнікі саслоўных груп далёка не заўсёды мелі ўяўленне аб сваіх правах і прывілеях паводле расійскага заканадаўства, а чыноўнікі і памешчыкі іх часта ігнаравалі. Пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. урадавая палітыка на тэрыторыі беларускіх губерняў стала больш акрэсленай, накіраванай на ліквідацыю асаблівых рыс у заканадаўчай сферы, функцыянаванні сацыяльных інстытутаў і адміністрацыйных устаноў. Гэта знайшло адбітак у стварэнні і дзейнасці Камітэта заходніх губерняў, паскарэнні разбору шляхты, уніфікацыі саслоўна-групавога складу сельскага насельніцтва.

Расійскім заканадаўствам сцвярджалася існаванне дваранскага саслоўя, але на самай справе яно не ўяўляла сабой адзінае цэлае. Дваранства падзялялася на спадчыннае і асабістае, якія юрыдычна мелі паміж сабой мала агульнага. Вышэйшае саслоўе Беларусі, прадстаўнікі якога выводзілі свой

радавод з часоў Вялікага Княства Літоўскага, не мелі такога падзелу. Юрыдычна беларуская шляхта незалежна ад свайго маёмаснага стану была роўнай.

Былая шляхта адрознівалася ад расійскага дваранства. Узнікненне першай было аналагічна тым працэсам станаўлення прывілеяванага саслоўя, што адбываліся ў краінах Заходняй і Цэнтральнай Еўропы. Яно было звязана з унутрыпалітычнымі працэсамі ў краіне, пераразмеркаваннем палітычных роляў паміж манархіяй і вышэйшым саслоўем. У Расійскай імперыі інстытут дваранства быў створаны для выканання адміністрацыйных і вайсковых функцый і рэгламентаваўся імператарам. Шляхта на час далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі ўяўляла сабой вельмі стракатую па свайму сацыяльнаму складу і шматлікую групу насельніцтва. Але гэта не перашкаджала ёй лічыць сябе дастаткова кансалідаванай на ўзроўні сацыяльнай псіхалогіі і этнапалітычных прыярытэтаў супольнасцю. У выніку далучэння часткі зямель Рэчы Паспалітай колькасць дваранства Расійскай імперыі ўзрасла амаль у тры разы, 70 % якога складала шляхта нованабытых тэрыторый. На мяжы XVIII–XIX ст. каля 90–95 % ад агульнай колькасці шляхты Беларусі складала дробная частка[5] яе прадстаўнікоў, якія самі працавалі на зямлі, займаліся нярэдка промысламі, служылі па найму, у тым ліку ў якасці падзёншчыкаў.

На вымыванне маламаёмаснай часткі былі накіраваны мерапрыемствы па «разбору шляхты». Імкненне ўрада пазбавіцца ад палітычна ненадзейнай і эканамічна беднай часткі вышэйшага саслоўя, выключыць дробную шляхту, прымусіць яе плаціць падаткі, выконваць рэкруцкую павіннасць прывяло да выдання ўказа 19 кастрычніка 1831 г. аб «разборы шляхты», паводле якога ўтварыліся штучныя і часовыя саслоўныя групы для незацверджанай у дваранстве шляхты – аднадворцаў і грамадзян заходніх губерняў. У 1868 г. катэгорыі аднадворцаў і грамадзян былі ліквідаваны і ўключаны ў склад сялянскага і мяшчанскага саслоўяў. Яны былі пазбаўлены асобага прававога статуса. Рэалізацыя палітыкі «разбору шляхты» ўкладвалася ў агульную ўрадавую лінію на павышэнне патрабаванняў да атрымання дваранскай годнасці асобамі недваранскага паходжання, якая выразна акрэслілася пачынаючы з 1845 г.

Мерапрыемствы па «разбору шляхты» аказаліся недастаткова эфектыўнымі, рэалізацыя гэтай палітыкі расцягнулася на дзесяцігоддзі і выклікала супраціўленне з боку шляхты, масавую падробку дакументаў, злоўжыванні ў дваранскіх сходах. Нават у 1864 г. у Віленскай губерні налічвалася 20 019 дваран, якія валодалі якой-небудзь уласнасцю, і 32 611 немаёмасных дваран, гэта значыць прадстаўнікоў дробнай шляхты[6].

Даволі часта прадстаўнікі малазямельнай і беззямельнай шляхты зараблялі сродкі для ўласнага існавання праз службу ў дзяржаўных установах. Паступова гэта шляхта страчвала сувязі са сваім асяродкам і традыцыямі, пераходзячы па свайму сацыяльнаму становішчу ў разрад разначынцаў. З гэтай групы ў значнай меры фарміравалася мясцовая інтэлігенцыя. Чыноўніцкая і вайсковая служба былі папулярнымі менавіта сярод дробнай шляхты, якая бачыла ў ёй шлях да захавання свайго сацыяльнага статуса і паляпшэння становішча. Сярод заможнай шляхты дзяржаўная служба была непапулярнай[7].

У канцы XVIII ст. урад у мэтах насаджэння землеўладання рускага дваранства і пашырэння памешчыцкай уласнасці праз канфіскацыі і раздачы зменшыў колькасць дзяржаўных сялян Беларусі ў 3 разы[8]. У першай трэці XIX ст. была спынена практыка падараванняў сялян ва ўласнасць, але мяжа паміж казёнымі і памешчыцкімі ўладаннямі захоўвалася нетрывалая. Пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. адбылося аднаўленне ранейшай удзельнай вагі дзяржаўных сялян. Гэты працэс праходзіў праз канфіскацыі прыватных і секулярызацыю царкоўных уладанняў і інш. Перавод былых памешчыцкіх сялян у разрад дзяржаўных сустракаў іх падтрымку і схільнасць да трансфармацыі ў аднародную саслоўную групу. Адрозненні ў назвах жыхароў казённых уладанняў, што захаваліся да сярэдзіны XIX ст. (старосцінскія, паманастырскія, пауніяцкія і інш.), мелі ўжо пераважна фармальны характар[9]. Іншая сітуацыя складвалася са спецыяльнымі, асабіста незалежнымі катэгорыямі сельскага насельніцтва – панцырныя баяры, вольныя людзі, аднадворцы, лясныя слугі і інш. Перавод іх у разрад дзяржаўных сялян выклікаў супраціўленне, упартыя спробы адстойвання сваіх ранейшых правоў і як вынік – захаванне на доўгі час фактычных асаблівасцей,

перш за ўсё на ўзроўні самаўсведамлення і менталітэту.

Пасля падаўлення паўстання 1863 г. расійскі ўрад перайшоў да фарсіраванай уніфікацыі нацыянальных ускраін імперыі, у тым ліку ў сацыяльна-саслоўнай і этнакультурнай сферах. Гэтаму аб'ектыўна садзейнічала разгортванне паскоранай мадэрнізацыі, узмацненне працэсаў сацыяльнай і тэрытарыяльнай мабільнасці жыхароў, пашырэнне урбанізацыі грамадства.

Выпрацоўка ўрадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі нярэдка вызначалася неадназначнасцю прынятых рашэнняў, наяўнасцю розных падыходаў і супярэчнасцей паміж цэнтральнымі органамі і мясцовай адміністрацыяй. Нават у перыяд і адразу пасля паўстання 1863 г., калі для расійскага ўрада стала зразумелай неабходнасць сістэмнай і паскоранай русіфікацыі заходніх ускраін, сярод вышэйшага чыноўніцтва сфарміраваліся два падыходы. Першы ўвасабляўся групоўкай, якая атрымала сярод сучаснікаў назву «руская партыя» (віленскі генерал-губернатар М.М. Мураўёў, ваенны міністр Д.А. Мілюцін, міністр дзяржаўных маёмасцей А.А. Зялёны і інш.). Другі – «партыяй касмапалітаў» (міністр унутраных спраў П.А. Валуеў, вялікі князь Канстанцін Мікалаевіч, міністр народнай асветы А.В. Галаўнін, кіраўнік жандармаў князь В.А. Далгарукаў, пецярбургскі генерал-губернатар князь А.А. Сувораў і інш.)[10]. Для іх былі характэрны прынцыпова розныя падыходы да выпрацоўкі метадаў інтэграцыі беларускіх і літоўскіх губерняў з велікарускім цэнтрам. Віленскі генерал-губернатар М.М. Мураўёў ставіў пад сумненне магчымасць сталага сацыяльнага супрацоўніцтва ўрадавых органаў з мясцовым польскім і каталіцкім дваранствам, рабіў стаўку на праваслаўнае сялянства і ў іх інтарэсах праводзіў аграрныя мерапрыемствы. Міністр унутраных спраў П.А. Валуеў, наадварот, зыходзіў з саслоўнага прынцыпу фарміравання ўнутранай палітыкі, лічыў, што беларускае і літоўскае паланізаванае дваранства павінна разглядацца як сацыяльная апора самадзяржаўя. Аднак для магчымасці ўплыву ўрада на мясцовае дваранства П.А. Валуеў прапаноўваў выкарыстоўваць праваслаўнае сялянства ў якасці стрымліваючага фактару, умацоўваючы супярэчнасці іх з памешчыкамі-каталікамі[11].

На менталітэт і самасвядомасць мясцовага дваранства беларускіх губерняў істотны ўплыў аказвалі дзяржаўна-палітычныя традыцыі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, вопыт ранейшай саслоўна-карпаратыўнай арганізацыі. Юрыдычна маючы аднолькавыя правы расійскага дваранства, але будучы больш арганізаваным і палітычна спрактыкаваным, паланізаванае вышэйшае саслоўе беларускіх губерняў аказвала значны ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё Расійскай імперыі. Нават у перыяд паўстання 1863 г. расійскія ўлады, абмяркоўваючы пытанне аб месцах высылкі ўдзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху, непакоіліся з прычыны магчымага пашырэння ў месцах высылкі радыкальных ідэй, значнага ўплыву паланізаваных пасяленцаў на мясцовае грамадска-культурнае жыццё.

Разбурэнню ранейшых саслоўных інстытутаў, пашырэнню уніфікацыйных працэсаў і ў канечным выніку пераходу да адкрытай грамадскай структуры, якая не стрымлівала сацыяльную мабільнасць насельніцтва, перашкаджалі створаныя на працягу стагоддзяў традыцыі ў сацыяльна-псіхалагічнай сферы, маральныя каштоўнасці. Апошнія былі падмацаваны настальгічнымі настроямі шляхты па страчанай дзяржаўнасці Рэчы Паспалітай, разгортваннем нацыянальна-вызваленчай барацьбы пад лозунгамі аднаўлення былых вольнасцей і краіны. Шляхта ў Расійскай імперыі захавала свае эканамічныя і сацыяльныя пазіцыі, сярэдняя частка яе нават умацавала іх. Але шляхта да падзелаў Рэчы Паспалітай у параўнанні з дваранствам іншых краін і народаў Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы валодала значна большымі палітычнымі правамі і мела адпаведныя традыцыі. Атрымаўшы меншыя магчымасці для выяўлення сацыяльнай актыўнасці, шляхта праявіла цікавасць да нацыянальна-вызваленчага руху. Гэты фактар аказваў значны ўплыў на трансфармацыю шляхты ў дваранскае саслоўе Расійскай імперыі. Нават працэсы маргіналізацыі шляхты, пераводу часткі яе ў падатковыя саслоўі закранулі ў першую чаргу сацыяльна-эканамічную сферу, маёмаснае і прававое становішча.

Нівеліроўка саслоўных абмежаванняў адбывалася, перш за ўсё, праз гандлёва-прамысловае расійскае заканадаўства, якое ў другой палове XIX – пачатку XX ст. насіла шмат у чым усесаслоўны характар[12]. Пацвярджэннем дадзенай тэндэнцыі стала вы-

данне Палажэнняў ад 1 студзеня 1863 г. і 9 лютага 1865 г. «Аб пошлінах за права гандлю і іншых промыслаў» і інш. Статут гандлёвы 1893 г., Статут аб прамысловасці 1893 г. дазвалялі займацца гандлем і засноўваць прамысловыя прадпрыемствы расійскім грамадзянам незалежна ад саслоўнай прыналежнасці. Гэта значна паўплывала на дынаміку колькасці купецкага саслоўя ў пачатку XX ст., зрабіла менш прывабным выкуп гільдзейскіх пасведчанняў. Тым не менш прыналежнасць да купецкага саслоўя заставалася прыцягальнай для яўрэяў беларускіх губерняў, якія ў выніку куплі адпаведных дакументаў маглі пражываць па-за межамі рысы аседласці. Мяшчане і сяляне часам прылічалі сябе да складу купецтва і тым самым атрымлівалі права на валоданне бестэрміновымі пашпартамі, вольна перамяшчацца па тэрыторыі краіны. Купецтва ў разглядаемы перыяд было адзіным саслоўем, уступленне ў шэрагі якога цалкам залежала ад штогадовай уплаты пэўнага грашовага ўзносу. Кошт гільдзейскіх дакументаў разам з прамысловымі пасведчаннямі і іншымі зборамі дасягаў дастаткова значнай сумы і быў даступны толькі заможным асобам. Купецкае званне ўспрымалася як сінонім буйной буржуазіі. Сярод купецтва Беларусі, паводле дадзеных перапісу 1897 г., пераважную большасць складалі асобы, якія прызналі ў якасці роднай мовы яўрэйскую. Па губернях іх удзельная вага складала: Віленская – 77,7 %; Віцебская – 84,85 %; Гродзенская – 81,4 %; Магілёўская – 90,79 %; Мінская – 86,02 %[13]. У наступную па колькасці групу ўваходзілі купцы, якія вызначылі роднай рускую мову. Па губернях лічбавыя паказчыкі ў адпаведным парадку размеркаваліся наступным чынам: 16,5; 10,6; 11,08; 5,81; 11,22 %. Трэцім па колькасці стаў купецкі асяродак, які адзначыў у якасці роднай беларускую мову: 0,2; 1,98; 2,17; 1,22; 2,54 %. Польскую мову прызналі роднай адпаведна па губернях – 3,15; 0,68; 0,13; 0,26; 0,85 % купцоў. Прыведзеныя дадзеныя сведчаць, што найбольшая колькасць рускамоўных купцоў пражывала ў заходняй частцы Беларусі, а прызнаўшых у якасці роднай мовы яўрэйскую – ва ўсходняй. Гэта з'ява тлумачыцца асаблівасцямі этнакультурных працэсаў і ўрадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі. Акрамя таго, змяненні па губернях і паветах удзельнай вагі купцоў, для якіх роднай была беларуская мова, знаходзіліся, як правіла, у супрацьлеглай залежнасці ад росту ці змяншэння колькасці польска- і рускамоўных купцоў.

Эвалюцыя саслоўнага заканадаўства Расійскай імперыі сведчыла аб паступовым фарміраванні грамадзянскай супольнасці і далейшым пераходзе да грамадзянскай роўнасці. Асновай станаўлення такой супольнасці выступала гарадское саслоўе мяшчан. У прававым сэнсе прыналежнасць да яго не вызначалася пэўнымі ўмовамі. Кожны, хто не належаў да якога-небудзь саслоўя, адпаведна расійскаму заканадаўству абавязкова прылічаўся да мяшчанства. У той жа час прыпісацца да сялянства можна было толькі са згоды сельскай грамады. Прыналежнасць да мяшчанскага саслоўя была пажыццёвай і перадавалася ў спадчыну, а таксама выключала магчымасць адначасова знаходзіцца ў іншым саслоўным званні[14]. Атрыманне мяшчанскага стану адбывалася толькі праз прыпіску да грамады якога-небудзь горада.

У апошнія дзесяцігоддзі XIX – пачатку XX ст. паступова больш даступнымі сталі межы саслоўяў для прадстаўнікоў іншых груп, пашырыўся пералік заканадаўча акрэсленых заняткаў для кожнага з саслоўяў, павялічыліся магчымасці ўнутрысаслоўнай мабільнасці. Важным фактарам павышэння свайго сацыяльнага статуса, у тым ліку міжсаслоўнай мабільнасці, стаў паказчык пісьменнасці, узровень атрыманай адукацыі. Статус у грамадстве паступова пачынае вызначацца на падставе асабістых дасягненняў у прафесійнай сферы. Саслоўнае паходжанне ўжо не магло поўнасцю і адэкватна вызначаць сацыяльную ролю, асабістыя дасягненні, аўтарытэт. Сацыяльную мабільнасць насельніцтва ў канцы XIX – пачатку XX ст. стала вызначаць усё больш складанае перапляценне розных фактараў. Адным з найбольш адчувальных стала атрыманая адукацыя. Сярод саслоўных груп насельніцтва Беларусі, паводле дадзеных перапісу насельніцтва 1897 г., найбольшай удзельнай вагой пісьменных вылучалася хрысціянскае духавенства. Узровень адукаванасці святароў-мужчын па ўсіх без выключэння губернях набліжаўся да 100 %; некалькі ніжэй ён быў сярод жаночай часткі духоўнага саслоўя – ад 85 да 95 %, але гэты паказчык быў у сярэднім вышэй за астатнія сацыяльныя групы насельніцтва[15].

Дваране і чыноўнікі па стану авалодання граматай займалі другую пазіцыю пасля духавенства. Ступень варыяцыі лічбавых паказчыкаў пісьменнасці дваран і чыноўнікаў па губернях была большай, чым у іншых саслоўных груп, за выключэннем сялянства. Больш высокім узроўнем пісьменнасці вылучаліся прадстаўнікі вышэйшага саслоўя Гродзенскай (91,5 %) і Віцебскай (79,2 %) губерняў. Нечакана нізкім аналагічны паказчык аказаўся ў дваран і чыноўнікаў Віленскай (66,4 %) і Мінскай (63,9 %) губерняў, што можна толькі патлумачыць спецыфікай фарміравання дзяржаўнага апарату і ўрадавай палітыкі ў беларускіх губернях у наступныя пасля падаўлення паўстання 1863 г. дзесяцігоддзі. Матэрыялы перапісу насельніцтва дастаткова аднароднымі лічбамі зафіксавалі стан пісьменнасці пачэсных грамадзян, купцоў, мяшчан і прадстаўнікоў іншых гарадскіх саслоўяў. Сярэднія паказчыкі іх па беларускіх губернях вар'іраваліся ў межах ад 57,2 % (Гродзенская губерня) да 47,8 % (Мінская губерня). Адчувальна больш адрозніваліся дадзеныя стану пісьменнасці жаночай часткі гарадскіх саслоўяў: іх колькасныя паказчыкі мелі больш значны дыяпазон варыятыўнасці – ад 45,3 % у паветах Гродзенскай губерні да 28,4 % у Мінскай.

Прадстаўнікі сялянскага саслоўя, якія пражывалі ў гарадах, мелі амаль у два разы вышэйшы за сярэдні па Беларусі ўзровень пісьменнасці. Найбольш высокі паказчык быў зафіксаваны ў гарадах Гродзенскай губерні (57,5 %). Вялікай варыятыўнасцю адзначаліся звесткі аб стане авалодання граматай сялянкамі, асабліва ў параўнанні паміж жыўшымі ў гарадах і сельскай мясцовасці. Тут колькасныя суадносіны пісьменных і непісьменных сялянак адрозніваліся ў шмат разоў. Напрыклад, у Мінскай губерні ўдзельная вага пісьменных сялянак, жыўшых у гарадах, складала 29,2 %, а ў сельскай мясцовасці – 3,8 %. Дыстанцыя паміж меншым і большым паказчыкамі амаль васьмікратная. У Магілёўскай губерні яна была блізкай да дзевяцікратнай, у Віцебскай і Гродзенскай – да пяцікратнай і толькі ў Віленскай – да двухкратнай. У мужчын-сялян такая характарыстыка была недалёка ад двухкратнай з невялікім дыяпазонам варыяцыі дадзеных па губернях[16].

К канцу XIX ст. адчувальнай стала тэндэнцыя пераўтварэння асобных саслоўяў у ганаровыя званні, але для Беларусі яна стрымлівалася існаваннем рэжыму абмежавальных законаў у дачыненні палякаў, каталікоў-беларусаў, яўрэяў і інш. У працэсе знікнення саслоўна-карпаратыўнай арганізацыі значную ролю адыгрывалі гарады, але для беларускіх губерняў гэты працэс стрымліваўся адносна невысокімі тэмпамі урбанізацыі і адчувальнай раз'яднанасцю сацыяльных працэсаў у горадзе і вёсцы па прычыне істотных адрозненняў у этнаканфесійным складзе і прававым становішчы насельніцтва.

У пачатку XX ст. ва ўрадавай палітыцы акрэслілася новая тэндэнцыя надання сялянству палітычных і грамадзянскіх правоў. Указам 5 кастрычніка 1906 г. адмяняўся шэраг абмежаванняў у прававым становішчы сялянства. Пашыраліся магчымасці паступлення на дзяржаўную службу, у навучальныя ўстановы, вольнага атрымання пашпартоў і выбару месца жыхарства; здымаліся абмежаванні адыходу сельскіх жыхароў на заробкі і г. д.[17] На тэрыторыі беларускіх губерняў дадзены працэс набыў спецыфічную афарбоўку ў адпаведнасці з мясцовай этнаканфесійнай сітуацыяй і неабходнасцю ўлічваць традыцыйныя ўстоі беларускага сялянства.

Пашырэнне ў другой палове XIX – пачатку XX ст. магчымасцей сацыяльнай мабільнасці стала адной з цэнтральных ліній развіцця саслоўных інстытутаў. Аднак, нягледзячы на паскарэнне гэтага працэсу, захоўвалася амаль нязменная бюракратычная сістэма зацвярджэння пераходу аднаго стану ў іншы. Акрамя таго, сямейныя традыцыі і нормы па-ранейнаму адыгрывалі значную ролю ў арганізацыі грамадскага жыцця многіх сацыяльных груп насельніцтва. Расійскае заканадаўства ў другой палове XIX – пачатку XX ст., з аднаго боку, зрабіла больш даступнымі саслоўныя межы мяшчанства, сялянства, фармалізавала прыналежнасць да купецтва, праз царкоўныя рэформы адмяніла замкнёнасць як саслоўя хрысціянскага духавенства і ў той жа час значна павысіла патрабаванні для атрымання дваранскай годнасці за заслугі на грамадзянскай і вайсковай службе. Асабліва быў ускладнены шлях выслугі спадчыннага дваранства. З пашырэннем мадэрнізацыйных працэсаў адбываецца станаўленне грамадзянскай супольнасці з характэрнымі для яго добраахвотнымі арганізацыямі, аб'яднаннямі, клубамі, палітычнымі партыямі і інш. Традыцыйнае гра-

мадства станаў і саслоўяў паступова змяняецца на класавае грамадства.

[1] Гл.: Каппелер А. Россия – многонациональная империя. М., 2000. С. 120.

[2] Там жа. С. 121.

[3] Гл.: Миронов Б.Н. Социальная история России периода империи (XVIII – начало XX в.): В 2 т. СПб., 1999. Т. 1. С. 46.

[4] Гл.: Жытко А.П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг. Мн., 2003; Люты А.М. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX стагоддзя. Мн., 2004; Полетаева Н.И. Купечество Беларуси: 60-е гг. XIX – начало XX в. Мн., 2004; Панютич В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. Мн., 1990; Самбук С.М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1980; Сосна У.А. Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Мн., 2000; Улащик Н.Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. М., 1965; Шыбека З. Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзяў). Мн., 1997.

[5] Гл.: Мыльников А.С., Якубовский В.А. Процесс разложения дворянства и его социальные последствия // Социальная структура общества в XIX веке. М., 1982. С. 315–316.

[6] Гл.: Улащик Н.Н. Указ. тв. С. 92.

[7] Гл.: Карева А. Виленская губерния: Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. СПб., 1861. С. 383.

[8] Гл.: Сосна У.А. Указ. тв. С. 108.

[9] Там жа. С. 110.

[10] Гл.: Комзолова А.А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ. М., 2005. С. 340.

[11] Гл.: Там жа.

[12] Гл.: Иванова Н.А., Желтова В.П. Сословно-классовая структура России в конце XIX – начале XX века. М., 2004. С. 26.

[13] Гл.: Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. СПб., 1903. Вып. IV: Виленская губерния. Тетр. 3. Табл. XXIV; СПб., 1903. Вып. V: Витебская губерния. Тетр. 3. Табл. XXIV; СПб., 1903. Вып. XI: Гродненская губерния. Табл. XXIV; СПб., 1904. Вып. XXII: Минская губерния. Табл. XXIV; СПб., 1903. Вып. XXIII: Могилевская губерния. Табл. XXIV.

[14] Гл.: Коркунов Н.М. Русское государственное право. СПб., 1909. Т. 1. С. 307.

[15] Гл.: Первая всеобщая перепись населения Российской империи… Вып. IV, V, XI, XXII, XXIII. Табл. IX.

[16] Там жа.

[17] Гл.: Корелин А.П. Политическая программа П.А. Столыпина: либерально-консервативный синтез // Либеральный консерватизм: история и современность: Материалы Всерос. науч.-практ. конф. М., 2001. С. 46.

Паступіў у рэдакцыю 15.12.08.

***Аляксандр Генадзьевіч Каханоўскі*** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу.